# ПОЛАЦКАЕ КНЯСТВА Ў IX—XI СТСТ.

***Урок гісторыі Беларусі, VI клас***

***Еўдакія Пузырная**, настаўніца гісторыі гімназіі № 61 г. Мінска*

**Мэта:** азнаёміць школьнікаў з сутнасцю Полацкага княства: развіваць лагічнае мысленне за кошт вырашэння праблемнага пытання; вызначыць ролю полацкіх князёў у дзяржаўным будаўніцтве, ацаніць дзейнасць Усяслава Брачыславіча (Чарадзея).

**Задача:** стварыць умовы для творчага пошуку пры вырашэнні праблемнага пытання «Ці было Полацкае княства дзяржавай?».

**Абсталяванне:** гістарычная карта «Старажытная Русь», атласы «Гісторыя Беларусі ў Сярэднія вякі», раздатачны матэрыял, тэставыя заданні.

### Ход урока

**Арганізацыйны момант:** вызначэнне тэмы і мэтаў урока.

***I. Актуалізацыя тэмы.***

**Франтальнае апытанне.** На аснове папярэдне вывучанай тэмы і ведаў па сусветнай гісторыі вучням прапануецца ўводная *праблемная задача*: адкажыце, як здарылася, што спачатку роўныя паміж сабою людзі пачалі прыгнятаць адзін аднаго?

*Адказы. Пабудова лагічнага ланцужка.*

Раздатачным матэрыялам № 1 з'яўляецца лагічны ланцужок, які дубліруецца на дошцы. Каб запоўніць яго, вучні павінны адказаць на пытанні настаўніка:

1. Якой супольнасцю жылі самыя першыя, найстаражытнейшыя людзі? **(Чалавечым статкам.)**

2. Якая супольнасць утвараецца затым? Чаму старажытныя людзі былі вымушаны жыць супольна? **(Родавая абшчына. Абшчыны аб'ядноўваюцца ў плямёны. Прымітыўныя прылады працы і паляванне не давалі магчымасці людзям выжыць паасобку.)**

3. Што такое племя? **(Трывалае аб'яднанне некалькіх родаў.)**

4. Што дазволіла асобным сем'ям выдзеліцца з родавай абшчыны? **(Развіццё прылад працы, выкарыстанне жалеза.)**

5. У родавай абшчыне прылады працы і яе здабыткі былі агульнымі. Ці маглі такія адносіны захавацца ў суседзяў? **(Не маглі, таму што колькасны склад сямей быў розным і яны валодалі неаднолькавымі прыладамі працы.)**

6. Як можна ахарактарызаваць маёмасны стан абшчыннікаў? **(Маёмасная няроўнасць, з'яўленне багатых і бедных.)**

7. Як багатыя абшчыннікі маглі захаваць сваю маёмасць і ўладу над бяднейшымі? **(Для захавання ўлады наймалі дружыну і іншых памочнікаў.)**

**ПАХОДЖАННЕ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ**

*Запоўнены варыянт ланцужка.*

Чалавечы статак → Родавая абшчына → Суседская абшчына → Маёмасная няроўнасць → Фарміраванне сілы ўлады → Утварэнне дзяржавы — апарату кіравання на асобнай тэрыторыі

У выніку вырашэння праблемнай задачы раскрываецца паняцце дзяржавы як апарату кіравання. Робіцца вывад, што ўтварэнне дзяржавы (апарату кіравання і прымусу) — гэта аб'ектыўны працэс, які не залежыць ад асобнага чалавека ці групы людзей.

**Настаўнік.** На прыкладзе Кіеўскай Русі вызначце, якія ўмовы неабходны для стварэння дзяржавы?

*Адказы вучняў: наяўнасць пэўнай тэрыторыі, сіла ўлады (князь і дружына), падатнае насельніцтва.*

gisdapamoga.by

**Настаўнік.** Што ўяўляла сабою Кіеўская Русь?

*Адказы вучняў: гэта супольная дзяржава ўсіх усходніх славян, у склад якой уваходзілі і беларускія землі, але ўлада кіеўскага князя не была абсалютнай, таму многія княствы былі адносна самастойнымі дзяржаўнымі ўтварэннямі. Тым не менш для лепшай абароназдольнасці ад знешніх ворагаў усе ўсходнеславянскія княствы знаходзіліся ў саюзніцкіх адносінах з Кіевам.*

***II. Вывучэнне новага матэрыялу і фарміраванне спосабаў дзейнасці па вырашэнні праблемнага пытання.***

*Праблемнае пытанне:* ці было Полацкае княства дзяржавай?

**1.** Абмежаванне асноўных момантаў вырашэння праблемнага пытання (план тэмы).

**Настаўнік.** Запішыце ў сшытак план тэмы і праблемнае пытанне.

1. Старажытны Полацк.
2. Полацкія землі.
3. Полацкая дынастыя.
4. Барацьба за тэрыторыю і незалежнасць.

**2.** Работа па гістарычнай і контурнай картах.

**Настаўнік.** Вызначце на карце шлях «з вараг у грэкі» і месцазнаходжанне Полацка. Абазначце на контурнай карце Полацк і волакі паміж Заходняй Дзвіной і Дняпром. Зачытайце паняцце «волак» і запішыце яго ў сшытак. Ацаніце геаграфічнае становішча Полацка.

**3.** Самастойная работа вучняў з тэкстам падручніка.

**Настаўнік.** Прачытайце тэкст на с. 64 і паслядоўна запішыце імёны прадстаўнікоў полацкай княжацкай дынастыі: Рагвалод (да 980); Ізяслаў (да 1001); Брачыслаў (1003—1044); Усяслаў Брачыславіч (1044—1101).

Вусна ахарактарызуйце постаць Усяслава Брачыславіча (Чарадзея).

**4.** Каменціраванае чытанне «Барацьба за шляхі зносін».

**Настаўнік.** Адкажыце на пытанні: за што ваяваў Брачыслаў Ізяславіч са сваім дзядзькам Яраславам Мудрым? якія прычыны ляжалі ў аснове барацьбы Усяслава Чарадзея з Яраславічам? як адносіцца да гэтага аўтар «Слова аб палку Ігаравым»? Запішыце ў сшыткі даты:

**1021 г.** — барацьба за волакі і пашырэнне тэрыторыі паміж Брачыславам і Яраславам Мудрым;

**1067 г.** — барацьба за пашырэнне тэрыторыі паміж Усяславам Чарадзеем і сынамі Яраслава Мудрага.

Зрабіце вусны прамежкавы вывад: **у адной краіне не можа быць ваенных сутычак за шляхі зносін і тэрыторыі, якія належаць гэтай краіне.**

***III. Вывад-доказ:*** ці было Полацкае княства дзяржавай?

*Вучні робяць вывад: так, таму што гэта была тэрыторыя; была дынастыя полацкіх князёў; было насельніцтва; была асабістая знешняя палітыка.*

***IV. Замацаванне атрыманых ведаў.***

Тэставыя заданні (у сшытках на друкаванай аснове), у тэсце на 9 балаў вызначце асобна ролю Усяслава Чарадзея. Зрабіце вусную разгорнутую характарыстыку Полацкага княства як дзяржаўнага ўтварэння.

***V. Падвядзенне вынікаў урока.***

Настаўнік, у залежнасці ад набраных балаў і вусных адказаў на працягу ўрока, ставіць адзнакі і каменціруе іх. Вучні малююць у канцы тэставых заданняў любы сімвал, які адпавядае іх настрою пасля ўрока. Настаўнік каменціруе сімвалы.

***VI. Дамашняе заданне.*** Вывучыце § 19, вызначце ролю Усяслава Чарадзея, закончыце работу ў тэставых сшытках.